ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 5 (906) | Серада, 27 сакавіка 1996г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


- **1. Клопат прафсаюза. Навіны універсітэцкага жыцця.**
- **2. "Містэр універсітэт-96".**
- **3. Аб юбілейных мерапрыемствах, прысвечаных стагоддзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры К.Крапівы.**
- **4.Што такое метралогія? Інтэрв'ю з нядаўна выбраным членам-карэспандэнтам Акадэміі метралогіі "Белая Русь" дацэнтам М.І.Аляшкевічам.**
- **5.Весткі з філалагічнага факультэта.**
- **6-7.Правілы прыему студэнтаў на завочны факультэт ГДУ. Каму прафком выдзяляў пуцёўкі?**
- **8. Пажарная служба папярэджвае. Культурная і спартыўная хроніка.**


## СУМЕСНА ВЫРАШАЮЦЬ НАВУКОВЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Польскае акустычнае таварыства і Інстытут фізікі тэхнічнага універсітэта Сілезіі сталі ініцыятарамі правядзення зімовых школ па малекулярнай і квантавай акустыцы. Сёлета яна была юбілейнай — 25-й па ліку і праходзіла на горным курорце г.Устрань. Разам з польскімі спецыялістамі ў яе рабоце ўдзельнічалі вучоныя Германіі, Расіі, Ізраіля і іншых краін. Беларусь тут у другі раз запар прадстаўлялі прарэктар па навуковай рабоце нашага універсітэта прафесар А.М. Сердзюкоў і вядучы навуковы спецыяліст кандыдат фізіка-матэматычных навук Г.С.Міцюрыч.

Вучоныя ГДУ прадставілі на зімовай школе, у рамках якой працаваў і першы ў Польшчы семінар па фотаакустыцы і фотатэрміцы, два даклады. А сааўтарамі іх трэцяга даклада стаў прафесар Ежы Ранахоўскі з Інстытута фундаментальных праблем тэхнікі Польскай Акадэміі навук. З гэтай навуковай установай нашы фізікі супрацоўнічаюць ужо на працягу пяці гадоў і дасягнулі значных вынікаў. Да іх адносяцца і нядаўна выдадзеныя два сумесныя прэпрынты і апублікаваны ў польскім керамічным часопісе артыкул.

Пад час знаходжання А.М.Сердзюкова і Г.С.Міцюрыча ў суседняй дзяржаве яны абмеркавалі са сваімі калегамі з Інстытута фундаментальных праблем тэхнікі ПАН рабочую праграму даследавання на 1996 г., план публікацыі сумесных навуковых прац, прыйшлі да дамоўленасці аб правядзенні чарговых тэматычных канферэнцый, якія павінны адбыцца ў маі і верасні бягучага года ў гарадах Бялая Вежа і Устрань.

Б.ВАЛОДЗІН.

## ВЯСЕННІ ПАДАРУНАК

Пад такой назвай кафедра беларускай культуры правяла напярэдадні свята 8 Сакавіка выстаўку твораў прыкладнога мастацтва студэнтаў-трэцякурснікаў, якія праходзяць спецыялізацыю "Арганізацыя і методыка пазакласнай і пазашкольнай работы". Будучыя педагогі -- філолагі, матэматыкі, біёлагі, гісторыкі, географы прадставілі на яе самыя разнастайныя экспанаты, зробленыя сваімі рукамі. Багатая фантазія, майстэрства, выдатны густ былі ўласцівы кожнаму вырабу, які займаў сваё пачэснае месца на выстаўцы.

Як асабліва арыгінальныя адзначаны работы: камплект са скуры, выкананы А.Юрусавай з геолага-геаграфічнага факультэта; вырабы з саломкі А.Папова (біяфак); макрамэ В.Сідарэнка (геолага-геаграфінны факультэт). Прафкомам студэнтаў названыя аўтары заахвочаны прэміямі па 80 тыс. руб. Атрымалі грашовыя ўзнагароды па 50 тыс. руб. Я.Крычаўцова з матфака, В.Савенка (філфак), Н.Шаламава, А.Немчанка, В.Бухалка (усе з гр. Н-34 філалагічнага факультэта).



**На здымку: у час знаёмства з экспанатамі выстаўкі.**

**Фота У.Чысціка.**

## ДЛЯ ЎЗМАЦНЕННЯ КАНТРОЛЮ І АДКАЗНАСЦІ

19 сакавіка адбылося пасяджэнне прэзідыума абкома прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. На ім разгледжана пытанне аб стане вытворчага траўматызму ва ўстановах адукацыі вобласці ў 1995 г. і мерах па ўзмацненню грамадскага кантролю за захаваннем правілаў па ахове працы і тэхнікі бяспекі.

Сярод выступіўшых са справаздачамі быў і старшыня прафкома нашага універсітэта Г.І. Варатніцкі.

Прэзідыум абкома прафсаюза ў прынятай пастанове адзначыў, што органамі адукацыі і камітэтамі прафсаюза вобласці накоплены некаторы вопыт работы па захаванню правілаў аховы працы ў новых умовах. Адначасова ўказана на істотныя недахопы і ўпушчэнні. Выяўлена недастатковая работа па папярэджанню вытворчага траўматызму ва ўстановах адукацыі шасці раёнаў і чатырох гарадоў вобласці, у тым ліку і нашага універсітэта, дзе летась адбыўся няшчасны выпадак са смяротным зыходам.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць прафесара кафедры алгебры і геаметрыі **КАМОРНІКАВА** Сяргея Фёдаравіча з прысуджэннем яму Прэзідыумам БелВАКа вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук; асістэнтаў названай кафедры **АНІСЬКОВА** Валерыя Валер'евіча і **НОВІКАВА** Сяргея Пятровіча з зацвярджэннем іх БелВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.*

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ ПРАФСАЮЗНЫ БЮДЖЭТ

На мінулым тыдні ў аўторак адбылося чарговае пасяджэнне прафсаюзнага камітэта універсітэта. Яго старшыня Г.І.Варатніцкі падзяліўся сваімі ўражаннямі ад сустрэч з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкам, які ў сакавіку на працягу двух дзён знаходзіўся ў Гомелі, гаварыў аб маштабнасці і важнасці тых праблем, якія абмяркоўваліся ў ходзе візіту кіраўніка нашай дзяржавы ў найбольш пацярпеўшую ад чарнобыльскай трагедыі вобласць.

На пасяджэнні прафкома разгледжаны вынікі выканання каштарысу прафсаюзнага бюджэту за 1995 год і зацверджана яго расходная частка на 1996 год. Па гэтаму пытанню выступіла бухгалтар прафкома Т.А. Валчкова.

# "МІСТЭР УНІВЕРСІТЭТ-96"

Прайшоў яшчэ адзін конкурс "Містэр універсітэт" -- шосты па ліку. І як прыемна было бачыць у зале "містэраў" мінулых гадоў: А.Аўсеенку, І.Прысяжнага, А.Сыцько, а Лёліка Каструлькіна яшчэ і на сцэне ў перапынках паміж конкурсамі, якіх было традыцыйна пяць: літаратурны, дзе ўдзельнікам прапанавалася за 5-7 хвілін напісаць свае тлумачэнне прызначэння 29 лютага; гаспадарчы, у гэтым годзе ён быў выязным (удзельнікам прапанавалася набыць у магазіне на эн-ную суму грошай набор прадуктаў да вячэрняга стала па пэўнаму поваду і растлумачыць свой выбар; конкурс, прысвечаны дню 8 Сакавіка, дзе ўдзельнікі павінны былі, прадставіўшы сябе нейкімі дамашнімі жывёлінамі (а выбар ва ўдзельнікаў, скажу я вам, быў ад слана і жырафа да сусліка і папугая), павіншаваць сваю гаспадыню са святам; тэатральны. У конкурсе -- дамашняе заданне ўдзельнікі павінны былі прадстаць перад гледачамі ў вобразе графа Каліостра і паспрабаваць упэўнена даказаць ім, што граф быў менавіта такім...; музычны (у гэтым годзе, як і ў мінулым, ён быў песенным, але зусім іншага плана). На гэты раз удзельнікам давялося нават саліраваць у імправізаваным хоры.

За тытул містэра змагаліся 6 студэнтаў нашай ВНУ, 6 прадстаўнікоў з розных факультэтаў: Г.Станкевіч -- матфак, С.Юдзіцкі -- філфак, В.Сокал -- геолага-геаграфічны факультэт, В.Собчанка -- біяфак, А.Аўсеенка -- эканомфак, А.Гарбачоў -- гісторыка-юрыдычны факультэт,



**На здымку: Сяргей Юдзіцкі -- "Містэр універсітэт-96"**

**Фота У.Чысціка.**

Я.Скібуноў -- фізфак. І "Містэрам-96", на мой погляд, стаў дастойнейшы -- Сяргей Юдзіцкі з філалагічнага факультэта. Крыху ад яго адставаў Андрэй Гарбачоў, які атрымаў тытул віцэ-містэра.

Пасля конкурсу я задала ім некалькі пытанняў, на якія яны ў пасляканцэртнай гарачцы пастараліся адказаць:

**-- Сяргей, ці не адчуваў ты няёмкасці з-за таго, што на сцэне было быццам бы 2 прадстаўнікі гісторыка-юрыдычнага факультэта? Таму што многія цябе ведаюць як Яга з версіі гістфака аб венецыянскім Маўры?**

-- Няёмкасці не было, так як я ўжо каля года вучуся на філфаку, а наогул я проста не задумваўся аб гэтым. Была мэта -- выйграць, а з Андрэем у мяне былі і застаюцца добрыя адносіны. А яшчэ мне хацелася б падзякаваць рабят, якія мне дапамагалі рыхтавацца да конкурсу. Гэта -- А.Якушэнка і Д.Хоміч.

**-- А ці быў ты ўпэўнены ў перамозе?**

-- Не, але мне было б крыўдна, калі б я стаў віцэ-містэрам.

**-- Ну, а што думае аб гэтым віцэ-містэр. Андрэй, ці марыў ты аб перамозе ці хаця б аб тытуле віцэ-містэр?**

-- Надзея памірае, як правіла, апошняй. Я прадчуваў, што барацьба будзе напружанай і таму галоўнай мэтай для мяне быў удзел, а не перамога.

**-- Ты не збіраешся ў наступным годзе зноў прыняць удзел у конкурсе?**

-- Бадай, не. Я лічу, што аднаго раза дастаткова. Спадзяюся, маю кропку гледжання падзяляюць і астатнія ўдзельнікі. Другасны ўдзел страчвае сваю навізну і прыцягальнасць для ўдзельніка і для гледачоў.

Вось якія яны розныя новыя пераможцы агульнауніверсітэцкага конкурсу "Містэр універсітэта".

**А.КАДОЛ,**
**студэнтка 3 курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**

# ПА ПРАБЛЕМАХ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ СТУДЭНТАЎ

На базе Брэсцкага політэхнічнага інстытута праведзены рэспубліканскі семінар-нарада старшынь прафкомаў студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Прадстаўнікі васьмі ВНУ рэспублікі абмяркоўвалі праблемы сацыяльна-эканамічнай абароны студэнцкай моладзі.

Паміж удзельнікамі семінара адбыўся зацікаўлены, дзелавы абмен думкамі, вопытам работы ў час пасяджэнняў "круглага стала", заслуханы даклады кіраўнікоў студэнцкіх прафсаюзаў ВНУ па ўдасканальванню работы прафкомаў студэнтаў у плане абароны законных правоў і інтарэсаў навучэнскай моладзі; аб формах і метадах іх дзейнасці па стварэнню неабходных умоў для вучобы і быту студэнцтва; аб праблемах арганізацыі яго летняга адпачынку і інш. На семінары падкрэслівалася думка, што гарантыяй абароны сацыяльна-эканамічных правоў моладзі павінна з'яўляцца заключэнне пагаднення паміж прафкомам студэнтаў і адміністрацыяй ВНУ.

З дакладам "Аказанне дапамогі прафсаюзным арганізацыям І курса ў рабоце па павышэнню паспяховасці і дысцыпліны студэнтаў" на семінары выступіла старшыня прафкома студэнтаў ГДУ Н.І.Колтышава.



# ЯГО ІМЯ Ў СЭРЦАХ НАШЫХ

У гісторыі беларускай нацыянальнай літаратуры адно з самых пачэсных месц займае народны пісьменнік, выдатны байкапісец і драматург Кандрат Крапіва. Яго разнастайнай творчай спадчыне можна толькі пазайздросціць. Гэта неаднаразова гучала ў прайшоўшыя сакавіцкія дні, калі шырока адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння славутага майстра слова.

Кандрат Кандратавіч Крапіва быў акадэмікам, віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі, ён -- заслужаны дзеяч навукі БССР, за сваю нястомную плённую працу ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы, узнагароджаны 10-цю ордэнамі, у тым ліку чатырма ордэнамі Леніна, медалямі. Ён -- тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

Ушанаванню памяці патрыярха паслякастрычніцкай беларускай паэзіі і прозы, аўтара шматлікіх літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў, лінгвістычных прац з нагоды яго юбілею прысвячаліся шматлікія мерапрыемствы. Найбольш значныя з іх адбыліся ў сталіцы Беларусі -- Мінску.

Жыццю і 70-гадовай творчай дзейнасці народнага пісьменніка была прысвечана навуковая канферэнцыя. Сярод іншых на ёй былі прадстаўлены даклады прарэктара нашага універсітэта дацэнта М.М.Воінава "К.Крапіва -- перакладчык" і дацэнта кафедры беларускай літаратуры В.І.Яцухны "К.Крапіва -- тэарэтык літаратуры".

На доме па праспекце Ф.Скарыны, дзе доўгі час жыў К.Крапіва, ва ўрачыстай абстаноўцы прымацавана мемарыяльная дошка.

Вялікая колькасць былых сяброў, вучняў Кандрата Кандратавіча і прыхільнікаў яго творчасці наведала магілу пісьменніка і да помніка на ёй ўсклала кветкі.

Юбілейнай даце з дня нараджэння К.Крапівы была прысвечана канцэртная вечарына, якая стала адметнай падзеяй для кожнага, хто на ёй прысутнічаў.

Адным з тых, хто быў у вельмі блізкіх адносінах з Кандратам Кандратавічам Крапівой, з"яўляецца заслужаны дзеяч навукі Беларусі прафесар кафедры беларускай мовы ГДУ У.В.Анічэнка. Ён сустрэўся са студэнтамі філалагічнага факультэта і падзяліўся ўспамінамі, якія засталіся ў яго ад шматлікіх сустрэч са слынным сынам беларускага народа.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

# СТАРЭЙШЫНЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Літаратурныя дні, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы, прайшлі на філалагічным факультэце. Праграма дзён прадугледжвала правядзенне разнастайных мерапрыемстваў. На выставе кніг можна было пазнаёміцца з цікавымі творамі, манаграфіямі аб творчасці славутага байкапісца і драматурга. У групах факультэта адбыліся сустрэчы з выкладчыкамі, якія працавалі, сустракаліся з К.Крапівою. Доктар філалагічных навук прафесар У.В.Анічэнка расказаў пра працу К.Крапівы як мовазнаўцы. Сваімі ўражаннямі аб сустрэчах з народным пісьменнікам падзяліўся кандыдат філалагічных навук В.І.Яцухна. Першакурснікі факультэта прынялі ўдзел у конкурсе чытальнікаў. На кафедрах беларускай мовы і літаратуры падрыхтаваны юбілейныя бюлетэні.

**Л.КУЗЬМІЧ,**
**намеснік дэкана філалагічнага факультэта па выхаваўчай рабоце.**





**На здымку:** перад студэнтамі філалагічнага факультэта выступае дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.І.Яцухна, тэма дысертацыі якога была прысвечана творчасці Кандрата Крапівы.

**Фота У.Чысціка.**

# ВАЖНЫЯ ЗАДАЧЫ МАЛАДОЙ АКАДЭМІІ

Загадчык кафедры фізічнай метралогіі нашага універсітэта дацэнт М.І.Аляшкевіч нядаўна выбраны членам-карэспандэнтам Акадэміі метралогіі "Белая Русь". З ім -- наша размова.

*-- Мікалай Іванавіч, што Вы можаце сказаць аб названай акадэміі і яе задачах?*

-- Яна была зарэгістравана Мінюстам Рэспублікі Беларусь 7 верасня 1994 года. На пачатку налічвала пяць акадэмікаў і 9 членаў-карэспандэнтаў. Сёлета ў студзені была зацверджана структура гэтай акадэміі, вызначаны яе рэгіянальныя аддзяленні.

Аддзяленне па Гомельскай вобласці прадугледжана стварыць на базе кафедры фізічнай метралогіі нашага універсітэта.

Галоўная мэта новай акадэміі -- гэта каардынацыя, арганізацыя і правядзенне фундаментальных і прыкладных даследаванняў, накіраваных на ўдасканальванне метралагічнага забеспячэння ў вытворчасці, навуковых даследаваннях, аховы здароўя і акаляючага асяроддзя, іншых сфер дзейнасці, а таксама на ўмацаванне нацыянальнай школы спецыялістаў-метролагаў. З гэтай мэтай вызначаны навукова-тэхнічныя саветы па разнастайных відах вымярэнняў, стандартызацыі і сертыфікацыі прадукцыі, падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы

**(Заканчэнне на 4 стар.)**



Фота У.Чысціка.

**На здымку:** загадчык кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры кандыдат педагагічных навук Г.І.Нарскін і студэнт факультэта фізічнай культуры майстар спорту па лёгкай атлетыцы Анатоль Будкоўскі, якія прызнаны лепшым трэнерам і лепшым спартсменам універсітэта 1995 года.

## "ХАРОШКІ" НА УНІВЕРСІТЭЦКАЙ СЦЭНЕ

Гэты вядомы не толькі ў Беларусі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль днямі быў госцем нашага універсітэта. Аматары танцавальнага мастацтва прыйшлі ў актавую залу на канцэрт "Харошак". Іх зачаравала выдатнае выканаўчае майстэрства ўдзельнікаў ансамбля, і ўзнагародай артыстам былі гарачыя апладысменты гледачоў.

## ТЭАТРАЛЬНАЯ ПРЭМ'ЕРА

Сёння, у Міжнародны дзень тэатра, на сцэне актавай залы ГДУ сваю прэм'еру -- спектакль Ф.Аляхновіча "Чорт і баба" паказвае студэнцкі тэатр-студыя "Если бы ..."

**Пачатак у 19.00.**

**Інфармуе служба 01**

# ПРАВІЛЬНА ЭКСПЛУАТУЙЦЕ ТЭЛЕВІЗАР

Сёння не толькі ў горадзе, але і ў самай аддаленай вёсцы цяжка знайсці дом без тэлевізара. Многія жыхары рэспублікі глядзяць тэлеперадачы ў каляровым адлюстраванні.

Аднак далёка не ўсе ведаюць, што тэлевізар можа загарэцца. У апошнія гады пачасціліся выпадкі ўзгарання тэлевізараў, якія нярэдка прыводзілі да пажараў у кватэрах і нават смерці людзей. Чаму гэта адбываецца? У сучасным тэлепрыёмніку да 40% дэталяў зроблены з лёгкаўзгараючыхся хімічных і іншых матэрыялаў. Да таго ж тэлевізар ужывае ток высокага напружання. Адбываецца гэта па дзвюх прычынах: з-за нізкай якасці камплектуючых дэталяў і парушэння правілаў эксплуатацыі тэлевізара.

Часцей за ўсё загараюцца прыёмнікі каляровага адлюстравання мінулых пакаленняў (лямпавыя). Пры гарэнні тэлевізара ў замкнутым пакоі плошчай да 20 кв. м небяспечная для жыцця канцэнтрацыя таксічных прадуктаў гарэння можа стварыцца праз 10-12 мінут з пачатку пажару. Знаходжанне ў атручанай атмасферы за гэтыя лічаныя мінуты можа прывесці да смерці чалавека.

Нельга пакідаць без нагляду працуючы тэлевізар. Ад перагрэву ён таксама можа загарэцца. Так, пасля "вясёлай" сустрэчы Новага 1996 года, сям"я Каплан (маці і сын) утульна размясціліся перад уключаным тэлевізарам і заснулі. Ад доўгай работы тэлеапарата і няправільнай эксплуатацыі здарыўся пажар. Жыццё людзей закончылася трагічна: задыхнуліся прадуктамі згарання.

Для папярэджання пажараў ад перагрэву тэлевізара пасля 3-4 гадзін бесперапыннай работы апарата рэкамендуецца выключаць яго з сеткі і даць магчымасць ахаладзіцца. Нельга ўстанаўліваць тэлевізар каля прыбораў ацяплення, на паліцы мэблевай сценкі -- там ён дрэнна вентыліруецца.

Некаторыя гаспадары маюць звычку ставіць на тэлевізар вазы з кветкамі. Гэта таксама небяспечна. У вільготным асяроддзі некаторыя дэталі прыёмніка самазапальваюцца пад напружаннем. Менавіта па гэтай жа прычыне тэлевізар, унесены ў цёплае памяшканне з вуліцы, нельга адразу ўключаць у сетку, лепш за ўсё гэта зрабіць на наступны дзень.

Нельга даручаць рамонт прыбора выпадковым людзям, а таксама прымяняць засцерагальнікі з напружаннем вышэй патрабуемага разліковага і намінальнага току.

Што рабіць, калі ў кватэры загарэўся тэлевізар?

Перш за ўсё трэба выключыць яго з электрычнай сеткі. Калі ў тэлевізары з"явілася полымя, трэба накінуць на яго коўдру або любую шчыльную тканіну, вынесці ў бяспечнае месца і паведаміць аб здарэнні ў пажарную ахову. Трэба хутка вывесці дзяцей і самому выйсці ў іншае памяшканне або на вуліцу.

І галоўнае, што павінен ведаць кожны ўладальнік блакітнага экрана: пры карыстанні тэлевізарам, як і любым іншым электрычным прыборам, неабходна строга захоўваць правілы пажарнай бяспекі.

**Л.НОВАК,**
**інспектар ВПЧ-І г.Гомеля.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- нямецкай мовы -- выкладчыка;

-- фізвыхавання -- ст. выкладчыка;

-- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- заг. кафедры.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, савет ветэранаў вайны і працы, выкладчыкі і супрацоўнікі гісторыка-юрыдычнага факультэта смуткуюць з выпадку смерці былой выкладчыцы кафедры гісторыі СССР і БССР **ГУСЕВАЙ** Маргарыты Васільеўны і выказваюць спачуванне яе родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паледрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 176.
Падпісана да друку 22.03.96.